Установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»

**ЗАЦВЯРДЖАЮ**
Рэктар БДУКМ
___________ Ю. П. Бондар
«____» ____________ 2015 г.
Рэгістрацыйны № ВД-___ /баз.

# УВОДЗІНЫ Ў БЕЛАРУСКУЮ СПЕЎНУЮ ЭТНАФОНІЮ

*Вучэбная праграма*
*для ўстановы вышэйшай адукацыі*
*па вучэбнай дысцыпліне для спецыяльнасці 1-18 01 01*
*Народная творчасць (па напрамках),*
*напрамку спецыяльнасці*
*1-18 01 01-05 Народная творчасць (фальклор)*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Мінск
БДУКМ
2015

**СКЛАДАЛЬНІКІ:**
*Э. В. Шчадрына*, выкладчык кафедры этналогіі і фальклору ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»;
*В. В. Калацэй*, загадчык кафедры этналогіі і фальклору ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», кандыдат культуралогіі, дацэнт

**РЭЦЭНЗЕНТЫ:**
*Т. Б. Варфаламеева*, старшы навуковы супрацоўнік дзяржаўнай навуковай установы «Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі», кандыдат мастацтвазнаўства;
*Л. Л. Ражкова*, загадчык кафедры беларускай народнапесеннай творчасці ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», кандыдат педагагічных навук

**РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ:**
кафедрай этналогіі і фальклору ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 7 ад 13. 03. 2014 г.);
прэзідыумам навукова-метадычнага савета ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 5 ад 18. 06. 2014 г.)

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Адказны за рэдакцыю: В. Б. Кудласевіч
Адказныя за выпуск: Э. В. Шчадрына, В. В. Калацэй

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Вучэбная праграма «Уводзіны ў беларускую спеўную этнафонію» належыць да блока агульнапрафесійных і спецыяльных дысцыплін вучэбнага плана падрыхтоўкі спецыялістаў па фальклоры і, у першую чаргу, прызначана для павышэння ўзроўню прафесійнай адукацыі студэнтаў-фалькларыстаў і паглыбленага вывучэння імі беларускай спеўнай традыцыі.

Дысцыпліна «Уводзіны ў беларускую спеўную этнафонію» мае інтэграцыйны характар. Для яе засваення студэнты выкарыстоўваюць веды, уменні і навыкі, набытыя падчас вывучэння смежных дысцыплін: «Фальклорны практыкум», «Культурная антрапалогія», «Этнаграфія», «Этнасеміётыка» і інш., што забяспечвае іх комплекснае ўзаемадзеянне ў мэтах фарміравання ў студэнтаў сістэмнага ўяўлення аб будучай прафесійнай дзейнасці.

Дэфініцыя «этнафонія»* (грэч. εσυος – народ, φωυή – гук) прапанавана ўкраінскім этнамузыколагам К. В. Квіткам для вызначэння спецыфікі тэмбравых асаблівасцей гуку, манеры выканання і асаблівасцей фразіроўкі ў народных спевах. Яе шырока ўжываюць ва ўсходнеславянскай фалькларыстыцы. У прыватнасці, дэфініцыю «этнафонія» выкарыстоўвалі ў сваіх публікацыях К.Квітка, І.Маціеўскі, А.Скорабагатчанка.

*Мэта* дысцыпліны – пазнаёміць будучых кіраўнікоў і артыстаў фальклорных ансамбляў з асаблівасцямі стыляў і манер выканання і інтанавання народных песень, якія характэрны для розных рэгіёнаў Беларусі.

*Задачы:*

– засвоіць паняційны апарат этнафоназнаўства;

– тэарэтычна асэнсаваць дыдактычныя прыёмы захавання этнафоніі беларускіх песень;

– асэнсаваць абраную аўтэнтычную манеру выканання;

– знаёміць з ёй, навучаць ёй іншых.

Азнаямленне з аўтэнтычнай манерай спеваў звязана з распрацоўкамі прадстаўнікоў беларусазнаўства, беларускай этна-

* Правапіс слова дадзены ў адпаведнасці з афіцыйна прынятым у беларускай навуковай літаратуры стандартам: Хай, М.К. Этнофония, этнафонія, етнофонія / М. К. Хай // Восточнославянский фольклор: словарь научной и народной терминологии / редкол.: К. П. Кабашников (отв. ред.) [и др.]. – Минск : Навука і тэхніка, 1993. – С. 464.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

музыкалогіі і аўдыявізуальнай антрапалогіі. Таму пры выкладанні шырока выкарыстоўваецца разнастайны культуралагічны матэрыял (тэарэтыка-практычныя напрацоўкі культурнай антрапалогіі, тэорыі камунікацыі, фільмы і аўдыязапісы этнолагаў і фалькларыстаў).

У выніку вывучэння дысцыпліны студэнты павінны *ведаць*:

– змест асноўных дакументаў, што складаюць прававую базу дзейнасці спецыяліста па этнакультурным выхаванні, этнічных спевах (рэкамендацыі ЮНЕСКА, дзяржаўныя праграмы Савета Міністраў, пастановы Міністэрства адукацыі і Міністэрства культуры, якія тычацца традыцыйнай культуры і фальклору, мастацкай адукацыі);

– змест асноўных паняццяў, якімі кіраўнікам фальклорных ансамбляў давядзецца аперыраваць у будучай прафесійнай дзейнасці;

– дакладнае размежаванне тыпалагічных асаблівасцей стылю і манеры выканання народных песень згодна этнаграфічнай карце Беларусі (напрыклад, падводка – Усходняе Палессе; пералівы – Падняпроўе; бурдон – Заходняе Палессе; паглыбленасць гучання – Палессе, больш блізкая манера – Падзвінне і г. д.).

У выніку вывучэння дысцыпліны студэнты павінны *ўмець*:

– аналізаваць аўдыязапіс народных выканаўцаў на прадмет этнафанічнай расшыфроўкі – мадэлявання з дапамогай фанетыкі тэкставага падрадковага перакладу і нотных знакаў дакладнага фарміравання гуказдабывання і інтанавання песні, якія характэрны спевакам-носьбітам традыцыі;

– праспяваць у ансамблі чатыры песні і дзве сольна, якія вызначаюць этнафанічныя (па стылі і манеры выканання) рэгіянальныя асаблівасці бытавання спеўных фальклорных жанраў розных рэгіёнаў Беларусі;

– выканаць адну з чатырох ансамблевых песень са спецыфічнай побытавай пластыкай, асаблівасці якой яскрава адлюстроўваюць уласцівасці народнага мастацтва (як цэласнай, сінкрэтычнай з'явы).

У выніку вывучэння дысцыпліны студэнты павінны *валодаць*:

– навыкам народнай вакальнай мелізматыкі – вакальныя фаршлагі, «гуканні», «скідванні»;



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– спевамі з так званым эфектам кампенсацыі, што абумоўлівае адчуванне рытмічнай свабоды, асабліва характэрнай для абрадавага меласу;

– навыкам дакладнага фарміравання ўнісону на апошнім *fermata* прымарнага тону ў канцы куплета народных (перш за ўсё абрадавых) песень.

*Метады* навучання ў рамках дадзенай дысцыпліны адпавядаюць агульным патрабаванням да фарміравання прафесійных кампетэнцый студэнта. Метадычнымі асновамі дысцыпліны з'яўляюцца: тлумачальна-ілюстратыўныя, рэпрадукцыйныя метады (апавяданне, тлумачэнне, гутарка, дыскусія, лекцыя, дэманстрацыя кіна- і аўдыязапісаў, палявых відэазапісаў аўтэнтычных абрадаў, метад слыхавога пераймання ў працэсе актуалізацыі фальклорнай спадчыны), праблемныя (творчы дыялог, вопыт, назіранне, эксперымент), метады самастойнай работы студэнтаў (работа з першакрыніцамі, расшыфроўка паэтычных тэкстаў аўдыя- і відэаматэрыялаў), кантрольна-ацэначныя метады (адказы на семінарах, практыкаванні).

У адпаведнасці з вучэбным планам на вывучэнне дысцыпліны «Уводзіны ў беларускую спеўную этнафонію» прадугледжана ўсяго 122 гадзіны, з якіх 50 гадзін – аўдыторныя заняткі (лекцыі – 36 гадзін, семінарскія – 14 гадзін).

Рэкамендаваная форма кантролю ведаў студэнтаў – залік.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## ПРЫКЛАДНЫ ТЭМАТЫЧНЫ ПЛАН

| Раздзелы і тэмы | Колькасць аўдыторных гадзін | | |
|---|---|---|---|
| | усяго | лекцыі | сем. зан. |
| **Уводзіны** | 2 | 2 | |
| **Раздзел І. Беларуская этнафонія ў рэчышчы культурнай антрапалогіі** | | | |
| *Тэма 1.* Культура і традыцыя ў культурнай антрапалогіі | 2 | 2 | |
| *Тэма 2.* Беларуская спеўная традыцыя: погляд антраполага | 2 | 2 | |
| *Тэма 3.* Умовы дзейнасці спецыялістаў – захавальнікаў традыцыі ў Беларусі | 2 | 2 | |
| **Раздзел ІІ. Складаючыя спеўнай этнафоніі** | | | |
| *Тэма 4.* Спеўная манера: гуказдабыванне | 4 | 2 | 2 |
| *Тэма 5.* Спеўны стыль: інтанаванне | 4 | 2 | 2 |
| *Тэма 6.* Этнафанічны сінкрэтызм: элементы этнахарэаграфіі і інструментальнай этнафоніі ў спевах | 6 | 4 | 2 |
| **Раздзел ІІІ. Гісторыка-этнаграфічнае раяніраванне і этнафонія** | | | |
| *Тэма 7.* Поўнач Беларусі: этнафанічныя асаблівасці | 6 | 4 | 2 |
| *Тэма 8.* Поўдзень Беларусі: этнафанічныя асаблівасці | 6 | 4 | 2 |
| *Тэма 9.* Усход Беларусі і Цэнтральная Беларусь: этнафанічныя асаблівасці | 4 | 4 | |
| **Раздзел IV. Асновы методыкі ў этнафоніі** | | | |
| *Тэма 10.* Уключанае назіранне і этнафонія | 4 | 2 | 2 |
| *Тэма 11.* Тэхналагічная замена ўключанага назірання | 2 | 2 | |
| *Тэма 12.* Уводзіны ў этнафонію ва ўмовах фармальнага і нефармальнага адукацыйных працэсаў у Беларусі | 6 | 4 | 2 |
| **Разам…** | **50** | **36** | **14** |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛУ

## *Уводзіны*

Мэта, прадмет і задачы дысцыпліны. Месца спеўнай этнафоніі ў фарміраванні этнічнай культуры. Сувязь этнафоназнаўства з іншымі адгалінаваннямі этнаграфіі і практычнай фальклярыстыкі. Асноўныя паняцці: «народ», «этнас», «гук», «народная культура», «этнічная музыка».

## Раздзел І. Беларуская этнафонія ў рэчышчы культурнай антрапалогіі

### *Тэма 1. Культура і традыцыя ў культурнай антрапалогіі*

Культурна-антрапалагічная дэфініцыя культуры; культура як агульнапрынятыя ў межах пэўнай супольнасці формы арганізацыі мыслення і паводзін. Месца аўтэнтычнага мастацтва ў мадэлях паводзін, што з'яўляюцца прыметамі (або аднымі з умоў) існавання народа як этнічнай адзінкі. Паходжанне культуры, аўтахтоннасць і міграцыйнасць культур. Этапы гісторыі краіны, што сфарміравалі этнагенез беларусаў (даіндаеўрапейскі, балтыйскі, славянскі, этап фарміравання беларускай народнасці). Погляды культуролагаў і гісторыкаў на вытокі традыцыйнай культуры, фальклор як на спадчыну першых суполак земляробаў і жывёлаводаў. Храналогія вясковай культуры земляробаў у Цэнтральнай і Усходняй Еўропе. Спецыфіка традыцыйнай культуры Беларусі: адбіткі этнічнай гісторыі Беларусі ў яе традыцыйнай культуры, спеўным фальклоры. Маргінальнасць як адна з характэрных рыс культуры сучасных урбанізаваных населеных пунктаў Усходняй Еўропы. Кагнітыўная і нейрапсіхалагічная неабходнасць існавання традыцыі.

### *Тэма 2. Беларуская спеўная традыцыя: погляд антраполага*

Камунікацыя як складальнік культуры: «азначэнне» (семіятызацыя) свету як вынік генетычнага імкнення чалавека да зносін. Асаблівасці камунікацыі ў традыцыйнай культуры: адрасаты (той, да каго скіравана паведамленне) і адрасанты (тыя, хто робяць паведамленне). Людзі і прырода як адрасаты камунікацыі ў фальклорных жанрах. Пэўныя асаблівасці

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

каляндарнай, працоўнай, сямейна-абрадавай спеўнай культуры як рэшткі гіерафоніі – зносін з сіламі, што, па разуменні носьбітаў традыцыйнай культуры, уплывалі на сезоннасць, ураджай, урадлівасць; дабрабыт прыватнага і грамадскага жыцця. Знакавасць як падстава сістэмнасці этнафоніі: «галасы» (гукавая партытура) народных абрадаў. Раннетрадыцыйная класіка фальклорных песень беларусаў як ядро іх этнічнай спеўнай культуры.

*Тэма 3. Умовы дзейнасці*
*спецыялістаў-захавальнікаў традыцыі ў Беларусі*

Сэнс дзейнасці – спрыянне згодна сацыяльнаму заказу з боку міжнароднай супольнасці і дзяржавы, захаванню форм традыцыйнай культуры як умовы самазахавання народа (этнасу). Камунікацыйныя мэты (якія ставяць у працэсе зносін у сістэме «педагог народных спеваў – вучань»: авалоданне манерай спеваў, характэрнай для рэгіёна ці мікрарэгіёна, да якога належаць навучэнцы), інтэнцыі (ператварэнне стратэгіі ў практыку: абранне дыдактыкі, дыдактычных матэрыялаў для навучання) і перспектывы (паўнаякаснае сезоннае існаванне спеўнай суполкі, упісанай у сацыяльную рэчаіснасць: у выглядзе этнічных класаў, спецыялізаваных груп ССНУ ці УВА, фальклорна-этнаграфічнага ансамбля). Прававая база: рэкамендацыі ЮНЕСКА пра захаванне фальклору, дзяржаўныя праграмы РБ па падтрымцы народнага мастацтва, пастановы Міністэрства адукацыі, Міністэрства культуры, што тычацца народнага мастацтва, эстэтычнага выхавання дзяцей і моладзі сродкамі народнай культуры. Месца народных спеваў у сферы дзяржаўных інстытутаў культуры (аматарская творчасць) і адукацыі (этнакультурнае выхаванне, спецыялізаваныя аддзяленні і кафедры ўстаноў вышэйшай адукацыі).

## Раздзел ІІ. Складаючыя спеўнай этнафоніі

*Тэма 4. Спеўная манера: гуказдабыванне*

Маўленне як крыніца этнічных спеваў. Арфаэпіка мовы, яе ўплыў на асаблівасці этнічных спеваў. Натуральнасць і глыбіня розных дыялектаў беларускай мовы. Гуказдабыванне ў высокім рэгістры (ротаглотачнае рэзаніраванне) і ў сярэднім рэгістры (грудное рэзаніраванне). Розныя прыёмы агласоўкі ў спевах.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Тэма 5. Спеўны стыль: інтанаванне*

Лінеарнасць як аснова музычнага стылю мыслення ў фальклоры беларусаў. Прынцыповая манодыя раннетрадыцыйнай класікі беларускіх песень. Разгорнутая мелізматыка, «гнуткасць» голасавядзення мелодый народных песень. Пачатковыя элементы поліфаніі ў спеўных стылях: гетэрафонія, бурдон, падводка. Асаблівасці інтанавання беларускіх народных песень: прахадная інтэрваліка, унісон-«труба» на *fermata* ў канцы куплетаў.

*Тэма 6. Этнафанічны сінкрэтызм: элементы этнахарэаграфіі і інструментальнай этнафоніі ў спевах*

Раннетрадыцыйны фальклор як узор сінкрэтызму народнага мастацтва. Рытуальная харэаграфія і яе пазнейшыя пераасэнсаваныя гульнявыя формы: карагоды, гульні; традыцыйна-пабытавы танец. Акампанемент, скрыпка і дуда – традыцыйныя інструменты беларусаў у крыніцах этнографаў XIX – першай паловы XX ст.

## Раздзел III. Гісторыка-этнаграфічнае раяніраванне і этнафонія

*Тэма 7. Поўнач Беларусі: этнафанічныя асаблівасці*

Гісторыка-этнаграфічныя рэгіёны: Паазер’е і Панямонне. Паўночна-ўсходні дыялект беларускіх гаворак. Манодыя як аснова мясцовага меласу. Мелізмы, надзвычай развітая музычная арнаментыка. Пачатковая поліфанія: антыфоны, каноны каляндарных і сямейна-абрадавых песень; кантрасна-лінеарнае шматгалоссе, абрад «барана». Тэмбравая дынаміка мясцовых спеваў, этнакультурныя сувязі і этнафанічная спецыфіка паўночных рэгіёнаў.

*Тэма 8. Поўдзень Беларусі: этнафанічныя асаблівасці*

Гісторыка-этнаграфічныя рэгіёны: Усходняе і Заходняе Палессе. Паўднёва-заходні дыялект, палеская група гаворак. Пачатковая поліфанія, гетэрафанічныя адхіленні ад унісону як характэрны тып гуртавога інтанавання на Палессі. Падгалосачна-поліфанічны тып інтанавання: спевы з падводкай, бур-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

донныя спевы. «Агрэсіўная» тэмбравая дынаміка мясцовых спеваў, этнакультурныя сувязі і этнафанічная спецыфіка спеўнай культуры паўднёвых рэгіёнаў.

*Тэма 9. Усход Беларусі і Цэнтральная Беларусь: этнафанічныя асаблівасці*

Гісторыка-этнаграфічныя рэгіёны: Падняпроўе, Цэнтральная Беларусь. Група сярэднебеларускіх гаворак. Карагоднасць, танцавальнасць як асноўныя рысы музычнага фальклору Падняпроўя. Падняпроўскія спевы з пераліВамі, з падцягам. Цэнтральны гісторыка-этнаграфічны рэгіён як перакрыжаванне традыцый розных рэгіёнаў, пераважныя ўплывы з Поўначы Беларусі. Тыпы гукавядзення ў спеўным фальклоры Міншчыны. Тэмбравая дынаміка мясцовых спеваў, этнакультурныя сувязі і этнафанічная спецыфіка ўсходняга і цэнтральнага рэгіёнаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## **Раздзел IV. Асновы методыкі ў этнафоніі**

*Тэма 10. Уключанае назіранне і этнафонія*

Урбанізацыя і міграцыя насельніцтва ў гарады сярэдзіны XX ст. «Новая фальклорная хваля» ў мастацтве ўсходнееўрапейскай часткі СССР у 60-я гг. «Фальклрысты, якія спяваюць». Ансамбль Дзмітрыя Пакроўскага. Дзейнасць балтыйскіх, украінскіх і беларускіх этнамузыколагаў. Культурна-антрапалагічны метад уключанага назірання як неабходная ўмова пераемнасці спеўных традыцый.

*Тэма 11. Тэхналагічная замена ўключанага назірання*

Вясковыя і гарадскія фальклорныя ансамблі, крыніцы перайманне мастацкіх узораў. Магчымасці аўдыятэхнікі: за і супраць. Сумяшчэнне тэхнагенных сродкаў навучання і жывых зносін з носьбітамі спеўнай традыцыі: фольк-клуб «Маладзёвы», ансамблі «Калыханка», «Куманёк» Ларысы Рыжковай.

*Тэма 12. Уводзіны ў этнафонію ва ўмовах фармальнага і нефармальнага адукацыйных працэсаў у Беларусі*

Спецыфіка дзяржаўных інстытутаў выхавання: *аматары*, *«этнакультурнае выхаванне»* ў пазашкольных установах і шляхам мастацкай адукацыі – *харавікоў і вакалістаў-народ-*

*нікаў* (сістэма «музычная школа – вучылішча мастацтваў – універсітэт культуры»). Рэспубліканскі праект «Танцавальны фальклор і дзеці», тыпавыя навучальныя праграмы «Фальклорны ансамбль», «Музычны фальклор», «Народная творчасць і вывучэнне спеўных стыляў Беларусі».

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА

## Літаратура

*Асноўная*


*1.* Вясна на Беларусі: рэпертуарны зб. / уклад.: В. Калацэй, Т. Пладунова. – Мінск : НЦТДІМ, 1998. – 54 с.

*2. Говард, Майкл.* Сучасная культурная антрапалогія / Майкл Говард ; пер. с англ. І. Карпікавай, М. Раманоўскага, А. Шыманскага ; пад рэд. П. Церашковіча. – Мінск : Тэхналогія : Беларускі фонд Сораса, 1995. – 478 с.

*3. Емельянов, В. В.* Развитие голоса: Координация и тренаж / В. В. Емельянов. – СПб. : Лань, 1997. – 190 с.

*4. Мельникова, Л. И.* Детский музыкальный фольклор в дошкольных образовательных учреждениях (на примере земледельческих праздников) / Л. И. Мельникова, А. Н. Зимина. – М. : Гном-Пресс, 2000. – 88 с.

*5. Можейко, З. Я.* Календарно-песенная культура Белоруссии: Опыт системно-типологического исследования / З. Я. Можейко. – Минск : Наука и техника, 1985. – 247 с.

*6. Мухарынская, Л. С.* Беларуская народная музычная творчасць: вучэб. дапам. для муз. ВНУ / Л. С. Мухарынская, Т. С. Якіменка. – Мінск : Выш. шк., 1993. – 343 с. : іл.

*7.* Мядоцкі край і яго таленты: даведнік фестывалю (30 мая – 1 чэрв. 1997 г., в. Мётча) / уклад. М. Козенка. – Мінск : ВЛАДИ-АРТ, 1997. – 109 с.

*8. Назаренко, И. К.* Искусство пения: Очерки и материалы по истории, теории и практике художественного пения: хрестоматия / И. К. Назаренко. – М. : Музыка, 1963. – 511 с.

*9.* Народная творчасць і вывучэнне спеўных стыляў Беларусі: праграма для музычных вучылішчаў па спецыяльнасці Г 11.18.01 Народны хор / уклад. І. Л. Сіневіч. – Мінск : БелІПК, 1999. – 24 с.

*10. Науменко, Г. М.* Фольклорная азбука: учеб. пособие для начальной школы / Г. М. Науменко. – М. : Издат. центр «Академия», 1996. – 136 с.

*11. Цітоў, В. С.* Этнаграфічная спадчына. Беларусь. Краіна і людзі: вучэб.-метад. дапам. / В. С. Цітоў. – Мінск : Беларусь, 1996. – 208 с. : іл.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*12.* Фольклорный ансамбль // Музыка: Программы для внешкольных учреждений и общеобразовательных школ / ред. Т. Овчинникова. – М. : Просвещение, 1986. – С. 356–366.

*Дадатковая*

*1.* Гульні, забавы, ігрышчы / уклад. А. Лозка. – Мінск : Беларус. навука, 1996. – 534 с. : нот. іл.

*2. Клюев, Е. В.* Речевая коммуникация: учеб. пособие для ун-тов и вузов / Е. В.Клюев. – М. : ПРИОР, 1998. – 224 с.

*3. Кодай, Золтан.* Учебное пособие по сольфеджио / Золтан Кодай. – М. : Композитор, 1993. – 168 с.

*4. Мыльников, А. С.* Язык культуры и вопросы изучения этнической специфики средств знаковой коммуникации / А. С. Мыльников // Этнографическое изучение знаковых средств культуры. – Л. : Наука, 1989. – С. 7–38.

*5.* Специфика учебно-воспитательной работы в фольклорных певческих коллективах: метод. пособие / сост. Л. В. Шамина. – М. : ВНМЦНТиКПР, 1984. – 103 с.

*6. Хазова, М. В.* Горенка: комплексное изучение музыкального фольклора / М. В. Хазова // Фольклор – музыка – театр: Программы и конспекты занятий для педагогов дополнительного образования, работающих с дошкольниками / под ред. С. И. Мерзляковой. – М. : Владос, 1999. – 120 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Пералік рэкамендуемых сродкаў дыягностыкі

Для дыягностыкі прафесійных кампетэнцый, выяўлення ўзроўню засваення ведаў і ўменняў па дысцыпліне рэкамендаваны наступны інструментарый:

– падрыхтоўка прэзентацый;

– падрыхтоўка пісьмовых кантрольных работ (заданняў);

– напісанне рэфератаў па асобных раздзелах дысцыпліны;

– напісанне дакладаў на навуковыя канферэнцыі па асобных тэмах дысцыпліны;

– вуснае апытанне студэнтаў на семінарах па распрацаваных тэмах.

## Метадычныя рэкамендацыі па арганізацыі і выкананні самастойнай работы студэнтаў

Самастойная работа выконваецца ў любой рэкамендаванай форме па агульным напрамку «разнастайнасць рэгіянальных спеўных традыцый» па адной з тэм, якія прыведзены ніжэй. Яна павінна мець тытульны ліст, асноўную частку і спіс літаратуры.

Тэматыка самастойнай работы з’яўляецца абавязковай, але студэнт мае права звузіць ці пашырыць абраную тэму. Пры напісанні работы можна выкарыстоўваць літаратуру па курсе.

### Формы выканання самастойнай работы:

– напісанне рэферата (не менш 12 старонак);

– распрацоўка візуальнай прэзентацыі (не менш 12 слайдаў);

– распрацоўка аўдыявізуальнай прэзентацыі (не карацей за 2 хвіліны дэманстрацыі).

### Прыкладныя тэмы для самастойнай работы:

1. Пераважны стыль музычнага мыслення Палесся.
2. Найбольш характэрны музычна-інструментальны склад Палесся.
3. Адмысловыя, адметныя песенныя жанры Палесся.
4. Пераважны стыль музычнага мыслення Падняпроўя.
5. Найбольш характэрны музычна-інструментальны склад Падняпроўя.
6. Адмысловыя, адметныя песенныя жанры Падняпроўя.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

7. Пераважны стыль музычнага мыслення Падзвіння.

8. Найбольш характэрны музычна-інструментальны склад Падзвіння.

9. Адмысловыя, адметныя песенныя жанры Падзвіння.

10. Пераважны стыль музычнага мыслення Панямоння.

11. Найбольш характэрны музычна-інструментальны склад Панямоння.

12. Адмысловыя, адметныя песенныя жанры Панямоння.

13. Пераважны стыль музычнага мыслення Цэнтральнай Беларусі.

14. Найбольш характэрны музычна-інструментальны склад Цэнтральнай Беларусі.

15. Адмысловыя, адметныя песенныя жанры Цэнтральнай Беларусі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Вучэбнае выданне*

**УВОДЗІНЫ Ў БЕЛАРУСКУЮ СПЕЎНУЮ ЭТНАФОНІЮ**

*Вучэбная праграма*
*для ўстановы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне*
*для спецыяльнасці 1-18 01 01 Народная творчасць (па напрамках),*
*напрамку спецыяльнасці*
*1-18 01 01-05 Народная творчасць (фальклор)*

Карэктар В. Б. Кудласевіч
Тэхнічны рэдактар Л. М. Мельнік

Падпісана ў друк 2015. Фармат 60x84 $^{1}/_{16}$.
Папера пісчая № 2. Рызаграфія.
Ум. друк. арк. 0,93. Ул.-выд. арк. 0,52. Тыраж экз. Заказ .

Выдавец і паліграфічнае выкананне:
УА «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы,
распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 1/177 ад 12.02.2014.
ЛП № 02330/456 ад 23.01.2014.
Вул. Рабкораўская, 17, 220007, г. Мінск.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ